**Праневіч Г.М. (Брэст)**

## Максім Багдановіч і эстэтычны свет Скарыны

Эстэтычная адкрытасць паэзіі М. Багдановіча вопыту сусветнай літаратуры вызначыла ўплыў на яго творчасць самых разнастайных літаратурна-эстэтычных плыняў і кірункаў: ад класічнай эстэтыкі мастацтва Антычнасці і Рэнесансу да эстэтыкі рэвалюцыйных дэмакратаў, дэкадансу і сімвалізму. Паэт, гісторык літаратуры і літаратурны крытык, ён сваім з’яўленнем радыкальна змяніў наш традыцыйны беларускі свет, адкрыўшы для беларусаў космас сусветнай культуры, сваёй прысутнасцю, неардынарнай мастацкай эстэтыкай ствырыўшы ў маладой беларускай крытыцы і філасофскай думцы цалкам новы дыскурс, у межах якога адкрывалася шырокая прастора для дыскусіі аб шляхах, спосабах і арыенцірах беларускага Адраджэння. І, адпаведна, самой літаратуры як важнейшай складовай часткі адраджэнскага руху, якая ўзначальвала гэты рух, была яго вешчуном і прарокам.

Не ўдаючыся ў дэталі і версіі, як і з чыёй канкрэтна ініцыятывы паўстала на старонках «Нашай нівы» знакамітая дыскусія 1913 г., можна смела сказаць, што яе тэма, ход абмеркавання, нарэшце, яе ўплыў на літаратуру, якая якраз у гэтую пару перажывала перыяд станаўлення і выпрацоўкі сваіх класічных асноў, – у першую чаргу – вынік і плён з’яўлення маладзейшай плеяды літаратараў – М. Багдановіча, С. Палуяна. Ды яшчэ старэйшага ад іх на 7–8 гадоў «нашаніўскага» інтэлектуала В. Ластоўскага, які таксама актыўна генерыраваў курс на абнаўленне і паскоранае развіццё літаратуры.

Сваю пазіцыю ў гэтай дыскусіі, як і вектар уласнага творчага развіцця, М. Багдановіч выразна абазначыў у двух празаічных апавяданнях – «Апокрыфе» («Калядная пісанка», 1913) і «Апавяданні аб іконніку і залатару…» («Наша ніва», 1914, № 7). У іх ён алегарычна выказаўся адносна ўзнятых у дыскусіі пытанняў словамі Хрыста («…Няма красы без спажытку, бо сама краса і ёсць той спажытак для душы» [2, с. 51]), адказаўшы і тым сваім апанентам, якія лічылі яго вершы «не для народа» беззмястоўнай паэзіяй «красы дзеля красы».

У «эстэцтве» М. Багдановіча, абсалютызацыі ім красы як асноўнай мэты мастацтва, здавалася б, сапраўды можна ўбачыць непасрэдныя перазовы з дэкадансам, калі не бачыць і не заўважаць падкрэсленае, тэндэнцыйна акцэнтаванае наследаванне паэтам у абодвух творах духу і стылю Скарынавых прадмоў да «Бивлии руской» і ў цэлым канцэптуальную зарыентаванасць на духоўную спадчыну Ф. Скарыны, на традыцыі айчыннага Рэнесансу. Як слушна заўважыла Л. Тарасюк, «Багдановіч і сімвалісты духоўна вельмі розныя велічыні, філасофскія асновы сімвалізму не ўспрымаліся паэтам як грунт уласнай творчасці, паколькі гэтыя ўплывы сінхранізаваліся з нацыянальным Адраджэннем, з ідэяй Маладой Беларусі» [6, с. 6].

Дамінуючы рэнесансавы чыннік эстэтыкі М. Багдановіча выяўляўся найперш у тым, што ён разумеў і ўспрымаў мастацтва ў гуманістычным вымярэнні гэтага паняцця – як справу розуму і рук чалавечых, як высокае і складанае рамяство, майстэрства, якое праз працу мастака можа ўздымацца да высокага натхнення. Невыпадкова ў вершы «Песняру», дзе ставіцца пытанне аб абавязках творцы ў дачыненні да абранага ім мастацтва, літаральна ўсё насычана, дыхае паветрам майстроўні: «Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

верш, / Абрабіць яго трэба з цярпеннем. / Як ударыш ты ім, – ён, як звон, зазвініць, / Брызнуць іскры з халодных каменняў» [1, с. 126]. Гэтае сваё рэнесансавае credo М. Багдановіч яскрава прадставіў і ў вершы «Ліст да п. В. Ластоўскага», дзе ў спаборніцтве боганатхнёнага генія Моцарта і працаўніка Сальеры апынуўся на баку Сальеры, які «ў творчасці усё хацеў паняць, / Ва ўсім упэўніцца, усё абмеркаваць, / Абдумаць спосабы, і матар'ял, і мэту / І горача любіў сваю свядомасць гэту» [1, с. 263–264].

Відавочна, як і рэабілітаваны ім герой пушкінскай драмы, М. Багдановіч культываваў свядомы, разумова-інтэлектуальны пачатак у мастацтве і творчасці, імкнучыся, як і мастакі эпохі Адраджэння, да дасканаласці, гармоніі, класічнай суразмернасці, упарадкаванасці і завершанасці сваіх твораў у адпаведнасці з законамі прыроды і логікай мыслення – тым самым сцвярджаючы ў беларускай паэзіі поруч з традыцыйнай для яе песеннасцю і жывапіснасцю экспрэсіўны інтэлектуалізм рацыяналістычнага кшталту. Прыкладам такога рацыянальнага мастацкага канструктывізму з'яўляецца кніга «Вянок», у якой усе змястоўныя і фармальна-кампазіцыйныя кампаненты (як кнігі ў цэлым, так і асобных вершаў) строга абдуманы і падпарадкаваны выяўленню скразной у творы (кнізе) ідэі адраджэння. Зборнік носіць універсальны характар, абдымаючы сабой і евангельскі міф аб смерці і ўваскрэсенні Хрыста, і класічную эпоху еўрапейскага Адраджэння XIII–XVI стст., і драму барацьбы за нацыянальна-культурнае адраджэнне пачатку XX ст., удзельнікам і сведкам якой быў сам паэт, ды і свой уласны лёс, што пралёг на трагічнай мяжы паміж жыццём і смерцю.

Праз усведамленне матэрыяльнага і духоўнага адзінства свету, сувязі паміж markedнымі часамі і эпохамі, уключанымі ва ўсеагульны касмічны працэс жыцця, смерці і адраджэння, на фоне якіх працякае людское жыццё, адбываецца росквіт і ўпадак цывілізацый і культур, змяняецца гісторыя народаў, М. Багдановіч стварaў мастацкую перспектыву, у якой мажлівымі станавіліся не толькі перазовы стагоддзяў, але і дыялог паміж сучаснікамі і папярэднікамі. Напрыклад, у вершы «Безнадзейнасць» паэт упершыню ў новай беларускай літаратуры вывеў на арэну нацыянальнага жыцця вобраз Францыска Скарыны, выказаўшы сваё разуменне і свае дачыненні да постаці вялікага гуманіста.

Каб вытлумачыць сэнс і значэнне створанага паэтам вобраза, трэба нагадаць, што ў эпоху Ф. Скарыны адзін з артыкулаў Літоўскага Статута пастанаўляў (пра гэта М. Багдановіч пісаў у «Белорусском возрождении»): «Писаръ земски (т.е. государственный канцлер) маеть по-руску (т.е. по-белорусски) литерами и словы рускими вси выписы, листы и позвы писати, а не иншимъ езыкомъ и словы» [2, с. 260]. У канцы XVII ст. пастановай сойма такое права замацоўвалася толькі за польскай мовай. Такім чынам, аб'ядноўваючы ў мастацкім часе верша «Безнадзейнасць» Ф. Скарыну, пісара вялікакняжацкай канцылярыі і ўласны аўтарскі вобраз, паэт не толькі імкнуўся раскрыць драматычныя абставіны развіцця беларускай культуры. Засланяючыся персонай «земскага пісара», ён выяўляў і драму ўласнага лёсу: хворы, нядужы, але моцны духам паэт прагне аднавіць былую славу роднай мовы, рэнесансавай кніжнай культуры і мастацтва, звяртаючыся за паратункам і лекамі да Ф. Скарыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як заўважыў А. Разанаў, «літаратура развіваецца не лінейна, а пасоўваючыся ў папярэдняе, у мінулае, ушчыльняючыся. Жывое шукае жывога, і новыя творцы знаходзяць пад напластаваннямі дзесяцігоддзяў, а то і стагоддзяў, сваіх папярэднікаў, каб узаемадзейнічаць з імі і, працягваючы іх, расці далей. Адтуль расці» [4, с. 7]. Менавіта ўкараненне ў традыцыі айчыннага Рэнесансу, раскрыццё і замацаванне ў літаратуры пачатку XX ст. скарынаўскай традыцыі ператваралі М. Багдановіча з таленавітага эксперыментатара над беларускім вершам у вялікага нацыянальнага паэта, дазволілі яму выпрацаваць сваю арыгінальную мадэль «беларускага шляху», які ён звязваў з патрыятычнай, па-еўрапейску адукаванай нацыянальнай культурнай элітай, з выхаваннем асобы рэнесансавага, гуманістычнага тыпу, правобраз якой паэт бачыў у апосталах-падзвіжніках і дзеячах, падобных да Францішка Скарыны – аднаго з «лепшых прадстаўнікоў тагачаснай беларускай інтэлігенцыі» [1, с. 261].

Ф. Скарына рана ўвайшоў у жыццё М. Багдановіча. Сваю ролю ў гэтым, безумоўна, адыграла знаёмства паэта з працай рускага даследчыка П.У. Уладзімірава, аўтара першай фундаментальнай працы «Доктор Франциск Скорина. Его переводы, печатные издания, язык» (1888). Аднак патрэбна было нешта значна большае, чым проста навуковыя веды, – супадзенне лёсаў і ментальнага тыпу асобы, спіраляў руху гісторыі, а магчыма, і становішча тых самых зорак на небе, аб якіх узгадваў паэт у вершы, – каб у эпоху рэвалюцыйна-атэістычных рухаў, на фоне больш чым сціплых дасягненняў тагачаснай беларускай гістарычнай і літаратуразнаўчай навукі і крытыкі, прызнаць у асобе Скарыны-біблеіста, выдаўца і аўтара каментарыяў да «Бивлии руской» пачынальніка і заснавальніка беларускай нацыянальнай традыцыі.

Субстанцыянальную сутнасць дачыненняў паміж М. Багдановічам і Ф. Скарынам, можа, у найбольшай ступені раскрывае і тлумачыць Скарынава філасафема з прадмовы да кнігі «Іоў», у якую ён заключыў сваё разуменне сэнсу і мэты чалавечага існавання: «…Ест наивышшая мудрость розмышление смерти и познание самого себе, и вспоминание на приидущие речи» [5, с. 20 ]. У гэтых словах – не толькі ключ да разумення асобы паэта (М. Багдановіча), яго жыццёвай філасофіі і творчасці, прасякнутых адраджэнскімі матывамі, памкненнямі да самапазнання і духоўнага самаўдасканалення, але і да шматлікіх твораў, у якіх няма прамых адсылак да Ф. Скарыны, але віруе і адчуваецца ў кожным павароце думкі сам дух, маштаб памкненняў вялікага гуманіста. «Жывеш не вечна, чалавек, – / Перажыві ж у момант век! / <…> Жыві і цэльнасці шукай, / Аб шыраце духоўнай дбай. / І ў напружэнні паўнаты / Свайго шырокага жыцця / Без болю, ціха зойдзеш ты / Ў краіну забыцця» [1, с.121].

Звышзадачу свайго жыцця М. Багдановіч бачыў у патрыятычным слугаванні народу цераз развіццё мастацтва, стварэнне духоўных каштоўнасцей «адраджэнчага характару» (А. Лойка), ва ўзбагачэнні тэм і форм роднай літаратуры, наданні ёй артыстызму, вытанчанасці, аваладванні ўсім лепшым, што ёсць у сусветнай культурнай спадчыне высокаразвітых літаратур.

Ва ўмовах новага імпульсу беларускага нацыянальнага адраджэння пачатку XX ст., якое нагадвала асобнымі рысамі эпоху рэнесансавага ўздыму, ідэал скарынінскага духу ўяўляўся М. Багдановічу вышэйшай мастацкай і ідэалагічнай каштоўнасцю. Магутны творчы імпульс, які ішоў ад Ф. Скарыны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

надаваў усёй творчасці М. Багдановіча непараўнальна большую маштабнасць, глыбіню, грамадскі рэзананс яшчэ і ў выніку своеасаблівай суаднесенасці гуманістычнай пазіцыі і культурнай ролі гэтых буйных творчых індывідуальнасцей у працэсе гістарычнага складвання беларускай нацыі, а таксама падабенства ідэйна-творчых задач, якія даводзілася вырашаць паэту на заключным этапе яе фарміравання.

Аднолькава блізкім Ф. Скарыну і М. Багдановічу было разуменне гістарычных задач свайго часу як шырокай гуманістычнай праграмы развіцця духоўных сіл народа. Можна прыгадаць, што менавіта М. Багдановіч першы абапёрся (як на ўласна нацыянальную) на выпрацаваную Ф. Скарынам яшчэ ў эпоху Рэнесансу традыцыю сінтэзу здабыткаў айчыннай культуры з дасягненнямі гуманістычнай заходнееўрапейскай культуры. Ва ўсякім разе, акрэслена можна гаварыць аб яе выразнай карэляцыі з культурна-асветніцкай праграмай М. Багдановіча, які задачу шырокага асваення здабыткаў сусветнай культуры сумяшчаў з не менш прынцыповым патрабаваннем: «беручы чужое, калі-нікалі даць і нешта сваё».

Калі ж улічыць яшчэ і блізкі склад мастацкага мыслення, які ў Ф. Скарыны і М. Багдановіча выявіўся ў прыярытэце рацыяналістычных пачаткаў светаадчування, ва ўспрыняцці прыгожага пераважна як разумнага, гарманічнага, мэтазгоднага, дык становіцца зразумелым, што адкрыццё і спасціжэнне скарынінскай традыцыі становілася для паэта арганічнай часткай рэалізацыі ўласных духоўна-эстэтычных патрабаванняў.

Пра нацыянальна-рэнесансавы тып творчасці М. Багдановіча, аб’ектыўна і суб’ектыўна скіраваны на закладзеныя Ф. Скарынам традыцыі, сведчыць выпрацаваная ім патрыятычная канцэпцыя асобы з яе катэгарычным імператывам вернасці радзіме, слугавання свайму народу.

Так, памкненні Ф. Скарыны «во великих послужити посполитому люду рускаго языка, сие малые книжки праци нашее приносимо им» [5, с. 56], яго ацэнка ўласнай дзейнасці як ахвяры на карысць народа адлюстроўваюць сутнасць і сэнс грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці М. Багдановіча і яго жыццёвага прадвызначэння. Патрыятызм, самаахвярнае служэнне свайму народу ўзводзіцца М. Багдановічам, як і Ф. Скарынам, у ранг вышэйшай гуманістычнай дабрачыннасці асобы, становіцца важнейшым сродкам яе індывідуальнага і грамадскага самавыяўлення і каштоўнасна-сэнсавай арыентацыі ў акаляючым свеце. «Таварышы-брацця! Калі наша родзіна-маць / Ў змаганні з нядоляй патраціць апошнія сілы, – / Ці хваце нам духу ў час гэты жыццё ёй аддаць, / Без скаргі палеч у магілы?!» [1, с. 111].

Ф. Скарына ўспрымаў і асэнсоўваў жыццё радзімы і свой уласны жыццёвы вопыт праз вечныя вобразы і сюжэты Бібліі, праз зварот да твораў Арыстоцеля, Цыцэрона і інш. Для М. Багдановіча такім «магічным крышталем» была, па сутнасці, уся сусветная і айчынная літаратура, адкуль ён чэрпаў веды і ўнікальны духоўны досвед. Флёр кніжнасці, яе тонкая празрыстая вуаль, як музейная цішыня, агортвае большасць твораў паэта, вылучаючы іх з прыроды і жывой рэчаіснасці, дэманструючы тым самым моц і ўмельства майстра.

У свой час І. Замоцін у артыкуле «Літаратурная спадчына М. Багдановіча» вылучыў два цэнтры эстэтычных рэфлексій паэта: «Адзін цэнтр

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– жыццё, сапраўднасць, тое быціе, якім азначаецца свядомасць, другі цэнтр – мастацтва, асяроддзе зачараваных люстраў, у якіх жыццё не толькі адбіваецца, але і пераламляецца ў самых прыгожых, найдзіўных формах» [Цыт. па: 4, с. 466]. Тыя ж два цэнтры эстэтычных рэфлексій лёгка заўважыць і ў творчасці Ф. Скарыны, прадмовы і пасляслоўі якога адсвечваюць адбітым святлом Бібліі – твора, у якім «вся бо Саломонова и Арестотелева божественная и житейская мудрость <…> краткыми словы замкнена ест» [5, с. 24].

Другі цэнтр – жыццё, якое дыктуе выбар біблейскіх тэм, сюжэтаў, герояў для каментарыяў, звязаных з выпрацоўкай мысліцелем першай у гісторыі Беларусі адраджэнскай канцэпцыі нацыянальна-духоўнага быцця. Якраз на гэтым этапе спасціжэння Ф. Скарыны М. Багдановіч узыходзіць на такую змястоўную вышыню адкрыцця духоўна-эстэтычнага свету свайго літаратурнага візаві, што ўплыў становіцца арганічнай часткай уласнага стылю. Як, напрыклад, у вершы «Кінь вечны плач свой аб старонцы!..», дзе сцверджаная М. Багдановічам на аснове сімволікі Скарынавага сігнэта ідэя адраджэння ўспрымаецца ўжо як грунт уласнай аўтарскай творчасці. «Кінь вечны плач свой аб старонцы! / Няўжо жа цёмнай ноччу ты / Не бачыш, што глядзіцца сонца / Ў люстэрка – месяц залаты? / Не згасла сонца? Сонца гляне, / Усіх падыме ада сна. / Ён, гэты дзень, яшчэ настане, – / І “ачуняе старана!”» [4, с. 110]. У гэтым узіранні «Сонца / Ў люстэрка – месяц залаты», у гэтай вытанчанай метафары, што ўзыходзіць да сімвалічнай эстэтыкі Скарынавых выданняў, бачыцца і нешта большае – гісторыя духоўнай гравітацыі-прыцяжэння двух геніяў, двух нябесных свяціл, што днём і ноччу асвятляюць-вартуюць шляхі нашага Адраджэння.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі, нататкі, чарнавыя накіды. – 1993.
3. Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск, 1997.
4. Разанаў, А. Знакі вертыкальнага часу / А. Разанаў. – ЛіМ. – 1986. – 8 жн.
5. Скарына, Ф. Творы : прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія / Ф.Скарына. – Мінск, 1990.
6. Тарасюк, Л. Прыгожае – гэта жыццё / Л. Тарасюк – ЛіМ. – 1991. – 6 сн.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ